**Рада па медыяэтыцы разгледзела скаргу на выкарыстанне тэрміна "нелегальныя мігранты"**

**ЗАЯВА**
**Рады па медыяэтыцы**
**11 ліпеня 2025 года**

Рада па медыяэтыцы ў складзе **Надзеі Белахвосцік, Валера Карбалевіча, Ганны Соўсь, Зоі Хруцкай, Ірыны Новік, Лолы Бурыевай** разгледзела зварот **Марыны Касінеравай** адносна артыкулаў “Самы папулярны тыкток-блогер у свеце, які высмейвае бязглуздыя лайфхакі, выдвараны з ЗША як нелегал” і “Нелегалы? «Наша Ніва» папала пад крытыку левых актывістаў за выкарыстанне выразу «нелегальныя мігранты», апублікаваных “Нашай нівай” 11 і 12 мая 2025 года. Спадарыня Касінерава лічыць, што выкарыстанне выразаў “нелегальныя мігранты” з’яўляецца мовай варожасці.

Рэдакцыя «Нашай Нівы» не з’яўляецца ўдзельнікам Медыяасамлеі, паколькі не далучылася да Пагаднення аб самарэгуляванні незалежнага медыясектара і да Кодэкса этыкі беларускіх журналістаў.

Аднак 16 чэрвеня 2025 года адбылося пасяджэнне Рады па медыяэтыцы, на якім было прынята рашэнне, што пытанне, узнятае ў звароце адносна выкарыстання тэрміна «нелегальныя мігранты» ў публікацыях «Нашай Нівы», мае сур’ёзнае значэнне для медыйнай супольнасці. У адпаведнасці з абзацам 3 пункта 13 Пагаднення аб самарэгуляванні незалежнага медыясектара, зварот быў разгледжаны Радай.

У выніку разгляду і абмеркавання Рада

**УСТАНАВІЛА:**

Адпаведна з Кодэксам прафесійнай этыкі беларускіх журналістаў мова варожасці недапушчальная ў публікацыях беларускіх журналістаў. (Раздзел 1)

1. Большая частка сябраў Рады прыйшла да высновы, што выраз “нелегальныя мігранты” мае прыкметы мовы варожасці. Рада падкрэслівае, што ў беларускай медыяпрасторы пакуль няма адзінадушнага стаўлення да гэтага тэрміна. Аднак, на думку Рады, медыя ў сваёй працы варта ўлічваць рэкамендацыі міжнародных структур. ААН і яе агенцтвы, найперш Упраўленне Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў (УВКБ ААН), Міжнародная арганізацыя па міграцыі (МАМ) і Упраўленне Вярхоўнага камісара ААН па правах чалавека (УВКПЧ), на працягу многіх гадоў заклікаюць пазбягаць тэрміна "нелегальныя мігранты".
2. Рэкамендацыі, як пісаць пра мігрантаў, распрацоўвалі і беларускія аўтары “Медыярэшэбніка” у раздзеле “Как писать о мигрантах”. Створаны інструмент, з

дапамогай якога можна праверыць тэкст публікацыі, якая рыхтуецца да выхаду, на наяўнасць некарэктнай лексікі. Правабаабаронцы падрыхтавалі свае рэкамендацыі для медыя.

3. Улічваючы, што за апошнія пяць гадоў тысячы беларусаў апынуліся ў вымушанай эміграцыі, праблема **выпрацоўкі медыякарэктнай лексікі** становіцца надзвычай адчувальнай і важнай для медыйнай супольнасці.

З улікам выкладзенага, Рада

**ВЫРАШЫЛА**

**рэкамендаваць беларускім медыя**:

- **Адказна і ўважліва ставіцца да выкарыстання фраз, якія могуць быць успрынятыя як дыскрымінацыйныя**.
- Калі тэрмін "нелегальныя мігранты" выкарыстоўвае суразмоўца журналіста, **варта дадаваць кантэкст, які апісвае сітуацыю**.
- Самім жа журналістам **варта пазбягаць гэтага тэрміна** ў сваіх матэрыялах.

Рашэнне прынята:

за - 5 галасоў,
супраць - 1 голас.

Старшыня Рады Надзея Белахвосцік